Выклік бабулі EU4Energy
(22 траўня – 1 чэрвеня 2020 года)

**Заклік да дзеяння**

**Вы жыхар Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдовы ці Украіны? Тады чаму б не ўзяць удзел у новым конкурсе EU4Energy? Бабуля #EU4Energy вярнулася, каб паказаць, як быць энергаэфектыўным дома. Стварайце кантэнт, які паказвае, як вы эканоміце энергію дома, і дзяліцеся — у форме відэа гісторыі ці фота. У вас будзе шанец выйграць адзін з 10 прызоў, уключаючы галоўны прыз вартасцю 300 еўра!**



**ПРАВІЛЫ ВЫКЛІКУ**

ТЭМА ВЫКЛІКУ: выклік у сацыяльных медыя арганізуецца камунікацыйным праектам EU4Energy. Тэма выкліку – **энергаэфектыўнасць дома**. Паглядзіце кліп, як наша бабуля #EU4Energy з унукамі пералічвае розныя спосабы эканоміі энергіі і энергаэфектыўнасці для тых, хто застаецца дома.

ХТО МОЖА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ: Конкурс адкрыты для грамадзян (асоб) з Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдовы і Украіны, у якіх ёсць персанальны акаўнт у Facebook, Instagram або VKontakte, узрост – ад васямнаццаці (18) гадоў. Не дапускаюцца да ўдзелу супрацоўнікі, стажоры, або партнёры членаў камунікацыйнай службы праекту EU4Energy, а таксама блізкія сваякі і члены сям'і згаданых супрацоўнікаў праекта.

АРГАНІЗАТАР: Арганізатарам конкурсу выступае камунікацыйны праект EU4Energy («арганізатар»). Конкурс ніякім чынам не звязаны, не спансуецца, не падтрымліваецца і не адмініструецца сацыяльнай сеткай Facebook.

ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ І ЎДЗЕЛ: конкурс будзе праходзіць з 22-га траўня па 1 чэрвеня 2020 года. Карыстальнікі прымаюць удзел у выкліку, ствараючы і дзелячыся кантэнтам (Інста-гісторыя, відэа ці фота) пра тое, што можна зрабіць, каб застаючыся дома паспрыяць энергаэфектыўнасці. Пры гэтым мусяць быць згаданыя акаўнты Facebook, Instagram і/або Vkontakte Праекта «Усходняе суседства ЕС». Прыняць удзел у конкурсе можна стварыўшы фота/выяву або відэа на сваёй роднай мове, англійскай або рускай. Вітаецца крэатыўнасць і пачуццё гумару.

Кантэнт павінны быць размешчаны ад імя індывідуальных асабістых акаўнтаў у адкрытым доступе. Бізнес-акаўнты будуць аўтаматычна дыскваліфікаваныя для ўдзелу ў конкурсе. Кожны ўдзельнік можа размясціць толькі адно фота/відэа.

ВЫБАР ПЕРАМОЖЦАЎ: пасля завяршэння часу для публікацый журы абярэ кароткі спіс фіналістаў, які будзе вынесены на аднарангавыя галасаванне VoteMe.App, даступнае для Android і iPhone. Удзельнік, які набраў найбольшую колькасць галасоў, атрымае галоўны прыз, а дзевяць астатніх удзельнікаў са спісу атрымаюць меншыя прызы.

ПРЫЗЫ: Усяго пераможцам будзе ўручана 10 прызоў[1]. Галоўны прыз — падарункавы ваўчар коштам 300 еўра — будзе ўручаны галоўнаму пераможцу. Прыз нельга перадаць іншай асобе, ён павінен быць прыняты пераможцам у якасці ўзнагароды. Пераможца не мае права патрабаваць грашовы эквівалент або замену прыза. Арганізатары не даюць інфармацыі пра статус удзелу. Арганізатары звяжуцца з пераможцамі пасля абвяшчэння вынікаў конкурсу па кантактнай інфармацыі, прадстаўленай удзельнікамі. Калі пераможца не адкажа арганізатарам на працягу 4-х працоўных дзён пасля абвяшчэння вынікаў, пераможцам будзе абвешчаны наступны удзельнік.

АГУЛЬНЫЯ ЎМОВЫ: Арганізатар пакідае за сабой права дыскваліфікаваць асоб, якія шкодзяць правядзенню конкурсу, парушаюць правілы або дзейнічаюць разбуральна і неспартыўна. У выпадку ўзнікнення спрэчкі адносна прыналежнасці запісу, уласнікам будзе прызнаны аўтарызаваны ўладальнік уліковага запісу, праз які быў размешчаны кантэнт.
АБМЕЖАВАННЕ АДКАЗНАСЦІ І ВЫЗВАЛЕННЕ АД ЯЕ: Прымаючы ўдзел, удзельнік згаджаецца не выказваць прэтэнзіі і не падаваць позвы, якія вынікаюць з удзелу ў конкурсе і атрымання або

[1] Прызы: сонечныя зарадныя прылады, знешнія акумулятары, прамацыйныя матэрыялы.

выкарыстання прыза адносна арганізатара конкурсу, Facebook, адпаведных матчыных, даччыных кампаній, філіялаў, і адпаведных службовых асоб, дырэктараў, супрацоўнікаў і агентаў (бакі, вызваленыя ад адказнасці). Гэта ўключае наступнае, але не абмяжоўваецца ім: (а) несанкцыянаванае ўмяшанне асобы ў конкурс; (б) тэхнічныя памылкі; (в) памылкі друку; (г) позняя дастаўка або недастаўка электроннай пошты; і (д) памылкі ў адміністраванні конкурсу. Удзельнік адмаўляецца ад права патрабаваць кампенсацыю на аплату паслуг адваката і кампенсацыю шкоды любога роду, уключаючы, але не абмяжоўваючыся, штрафнымі, ускоснымі, прамымі або непрамымі стратамі.

КАНФІДЭНЦЫЯЛЬНАСЦЬ І ПУБЛІЧНАСЦЬ: Любая інфармацыя, якую ўдзельнік прадстаўляе ў заяўцы на ўдзел у конкурсе, прадстаўляецца камунікацыйнай службе праекта EU4Energy, а не Facebook. Удзельнік згаджаецца з выкарыстаннем арганізатарам імя ўдзельніка і імя профілю ў любым спісе пераможцаў (у адпаведных выпадках). Гэтая інфармацыя будзе выкарыстаная толькі для сувязі з пераможцамі. Імя ўдзельніка і імя профілю могуць быць выкарыстаныя ў рэкламных мэтах без дадатковай аплаты або разгляду.

СПРЭЧКІ: Удзельнік згаджаецца, што любыя спрэчкі, прэтэнзіі і падставы для іскаў, якія вынікаюць з або звязаныя з конкурсам або любым атрыманым прызам павінны быць вырашаны ў індывідуальным парадку, без прымянення любой формы калектыўных іскаў і выключна адпаведным судом у Брусэлі. Усе пытанні, якія тычацца складання, ахопу, тлумачэння і дзеяння дадзеных Афіцыйных правілаў, правоў і абавязкаў удзельніка, правоў і абавязкаў арганізатара ў сувязі з правядзеннем конкурсу, рэгулююцца і тлумачацца ў адпаведнасці з законамі Бельгіі, прэтэнзіі па выбары прымянення законаў любой юрысдыкцыі; акрамя Бельгіі (у Бельгіі або любой іншай юрысдыкцыі) не ўлічваюцца.

ЗГОДА З ПРАВІЛАМІ: Удзел у конкурсе прадугледжвае поўную згоду з вышэйпазначанымі правіламі.

ПЫТАННІ: Любыя пытанні пра конкурс можна задаваць па электроннай пошце: EU4Energy@ecorys.com